Ігуменскі тракт

№ 4 (62)

■ Дзеля памяці

ПЕРШАЯ СУСВЕТНАЯ: ПРАСТОРА ВАЙНЫ І МІРУ

Сёлета мы адзначаем 100-годдзе з дня пачатку Першай сусветнай вайны. Гэта тая вайна, калі ўпершыню была ўжыта хімічная зброя, калі ў небе ляталі вялізныя дырыжаблі, калі баі вяліся пераважна на тэрыторыі Беларусі, таму наша зямля моцна спаласавана акопамі тых часоў, як шрамамі... Час узгадаць, час сабраць камяні з тых руін...

Пра кнігу Вячаслава Бандарэнкі «Героі Першай сусветнай», якая выйшла напрыканцы мінулага года, «Звязда» ўжо пісала. Аднак хочацца прыгадаць, што яна ўяўляе сабой збор біяграфій самых розных людзей таго часу: і генерала, і звычайнага салдата, і сястры міласэрнасці. Прычым усе факты з'яўляюцца гістарычна праўдзівымі: аўтар умее працаваць з архівамі і знаходзіць у іх самае цікавае. У той жа час мова выдання зусім простая, чытаць такія біяграфіі вельмі займальна. Менавіта так, праз лёсы людзей, якія змяняла, ламала вайна, мы можам стаць крыху бліжэй да вайны, якую нам усё ж неабходна ведаць.

Як вядома, адзіны музей гісторыі Першай сусветнай знаходзіцца ў вёсцы Заброддзе Вілейскага раёна. Аднак падчас XXI Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу яго экспанаты часова размясціліся ў выставачным цэнтры БелЭкспа. Аказалася, што прафесійна зробленая экспазіцыя добра глядзіцца не толькі ў вясковай капліцы-музеі. Шматлікія сталічныя наведвальнікі прыходзілі сюды, каб на свае вочы ўбачыць рарытэты тых часоў.

Нязменны захавальнік калекцыі мастак Барыс Цітовіч таксама завітаў на кніжны кірмаш. Аднак на гэты раз ён за старажытным станком друкаваў для наведвальнікаў памятныя экслібрысы... Яго жонка, а таксама калектыў, які прыехаў з Вілейкі, выконвалі песні і чыталі вершы часоў Першай сусветнай.

Калекцыянер Уладзімір Ліхадзедаў прадаставіў сваю калекцыю паштовак з сюжэтамі той вайны. Яны ілюструюць тагачаснае ваеннае жыццё і побыт. Подпісы на іх дапамагаюць зразумець, у якім канкрэтна рэгіёне застаў вайну фатограф.

Нацыянальны гістарычны музей Беларусі старажытныя выявы з гэтай калекцыі Ліхадзедава

Дзве вайны, якія адбыліся ў XX стагоддзі, сталі пасылам да таго, каб Еўропа аб'ядналася.

ўзяў на часовае экспанаванне. Паштоўкі павялічаны і размешчаны на асобных стэндах. Цяпер на іх можна разглядзець усе, нават самыя дробныя дэталі. Дарэчы гэтая выстава пазіцыянуе сябе як перасоўная, таму, відавочна, яе можна будзе ўбачыць яшчэ не раз, і ў розных месцах.

Намеснік кіраўніка місіі Пасольства Германіі ў Беларусі Хольгер РАПІЁР, які прысутнічаў на адкрыцці выставы, даў сваю ацэнку падзеям стагадовай даўніны:

— Гэтаксама, як і ў іншых еўрапейскіх краінах, у Германіі Першая сусветная вайна разглядаецца як пачатак вялікай катастрофы. Дагэтуль нацыі і народы не маглі ўсвядоміць, што войны могуць мець такія разбуральныя маштабы. Колькасць людзей, якія былі задзейнічаны ў гэта вайне, проста велізарная. Таксама колькасць тэхнікі, якая выкарыстоўвалася менавіта ў Першай сусветнай, была надзвычай вялікай. На жаль, наступствы той жудаснай вайны ўсё ж не перашкодзілі таму, што праз невялікі прамежак часу зноў распачалася страшная вайна. Толькі пасля заканчэння Другой сусветнай, магчыма, стала зразумелым, як ад канфрантацыі перайсці да супрацоўніцтва і стварэння агульнай прасторы. Гэтыя дзве вайны, якія адбыліся ў XX стагоддзі, якраз сталі пасылам да таго, каб Еўропа аб'ядналася. Шмат робіцца ў кірунку еўрапейскай інтэграцыі: ёсць свае перамогі і свае паражэнні. Аднак, нягледзячы ні на што, мы павінны імкнуцца да таго, каб еўрапейскія краіны сталі больш блізкімі адна да адной. Тыя ўрокі, што мы здабылі з абедзвюх войнаў, павінны нам у гэтым дапамагчы.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ. Фота Надзеі БУЖАН

■ Далёкае — блізкае

ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ МАЁНТКА ТЫЗЕНГАЎЗА

Як нашы сучаснікі ўшаноўваюць гарадзенскага старасту

Сядзібная брама другой паловы XVIII ст.

Адраджэнне гістарычных аб'ектаў — гэта ў нас, як правіла, справа дзяржавы і бюджэту. Альбо, здараецца, буйных фінансавых ці прамысловых структур. І рэдка калі (і не толькі ў Беларусі) гэтыя клопаты бяруць на сябе прыватныя асобы. Цікава, што імі рухае? І якога выніку можна дасягнуць з пункту гледжання павагі да нашай спадчыны і гармоніі такога аб'екта з сучаснымі рэаліямі? Каб атрымаць адказы на гэтыя пытанні, карэспандэнт «Звязды» накіраваўся ў вёску Караліно Гродзенскага раёна, дзе завяршаецца аднаўленне старажытнай сядзібы, адным з гаспадаром якой у другой палове XVIII стагоддзя быў гарадзенскі староста, падскарбій (міністр фінансаў) Вялікага Княства Літоўскага Антоній Тызенгаўз.

Аднойчы ўбачыць і вярнуцца

Знаёмства з гістарычным маёнткам (а цяпер аграсядзібай «Каралінскі фальварак Тызенгаўза») пачынаецца з уязной брамы, пабудаванай з буту і каменя ў другой палове XVIII стагоддзя. Гэта адзін з нямногіх гістарычных аб'ектаў, што захаваўся практычна цалкам і патрабуе хіба што невялікай рэстаўрацыі. Прычым Павел Клімук, ініцыятар адраджэння сядзібы і адзін з яе цяперашніх гаспадароў, упершыню пабываў тут яшчэ ў 1992 годзе, калі пасля заканчэння Мінскага медінстытута прыехаў па размеркаванні ў Гродна.

— Ніякага жылля ў абласным цэнтры не далі, і тады я «паклаў вока» на Караліно. Вельмі спадабаліся тутэйшыя мясціны, дзе спачатку і хацеў пабудаваць дом. Але ў той час не склалася: участак пад дом выдзелілі ў суседніх Каробчыцах. Там пабудаваўся і жыў. А ў 2003 годзе лёс зноў прывёў мяне ў Караліно...

Павел Клімук ужо даўно займаецца ў Гродне прыватнай медыцынскай практыкай, пабудаваў сваю клініку. Але толькі прафесійнымі клопатамі не абмежаваўся.

— Цікавасць да гістарычных сядзіб з'явілася ў мяне яшчэ са студэнцкіх часоў. Акрамя працы ў будатрадах, мы яшчэ прымалі ў Мінску валанцёраў з Даніі, Германіі, Францыі. Паказвалі ім Беларусь, разам працавалі на раскопках у Траецкім прадмесці. А потым былі за мяжой у міжнародных моладзевых лагерах, дзе жылі ў старажытных сядзібах. Там я ўпершыню ўбачыў, як можна нават у будынку, дзе мала што засталося з далёкай мінуўшчыны, захаваць гістарычны каларыт.

Пашчасціла Паўлу і на сяброў, якія, кажа, яго «зацягнулі ў гісторыю» — гісторыкаў, архітэктараў, святароў ...

— Дзякуючы сябрам я даведаўся, хто такія Кастусь Каліноўскі, Ларыса Геніюш, Міхаіл Забэйда-Суміцкі... Чым адрозніваюцца, напрыклад, Дзярэчын, Зэльва і Ваўкавыск... Што для нашай краіны азначае Грунвальд... Бралі мы з супрацоўнікамі клінікі аўтобус (як правіла, на Дзень медыка) і ехалі ў падарожжа па Гродзеншчыне, потым — па Брэстчыне... Я па-іншаму ўбачыў нашу Беларусь. Яна адкрылася мне ў зусім іншым ракурсе, чым апісвалася ў некаторых гістарычных кнігах. Прачнулася, даруйце за высакамоўнасць, нешта патрыятычнае.

— Адсюль і жаданне паклапаціцца аб гістарычнай сядзібе ў вёсцы Караліно?

— Так. Гэта звязана перш за ўсё з тым, што адным з яе ўладальнікаў быў Антоній Тызенгаўз — велічыня, легендарная асоба ў гісторыі нашага краю, чалавек, у якім, нягледзячы на ўсе памылкі і недахопы, плюсы ўсё роўна пераважваюць. Калі б я гэтага не ведаў, то, можа, і не «цюкнула» б у душы, каб узяцца за выратаванне сядзібы. Няхай гэта будзе наш падарунак памяці Антонія Тызенгаўза.

Тронная зала (крайні справа — Павел КЛІМУК).

Вочы баяцца, а рукі робяць

Аднаўленне гэтага гістарычнага аб'екта сям'я Клімукоў у партнёрстве з сем'ямі Кобрынцаў, Цюлькевічаў і Крысціновічаў праводзяць з 2003 года. Як кажа Павел Клімук, «вочы баяцца, а рукі робяць». І як прыгожа! З якой павагай да тутэйшых адметнасцяў!

Пры гэтым ідэя была ў тым, каб не проста нешта аднавіць, пабудаваць, а каб самім тут жыць. Зямельныя адносіны з ранейшымі ўласнікамі, хаця і не без праблем, але ўдалося вырашыць. І сёння Павел Клімук хоць і працуе ў Гродне, адчувае сябе вясковым жыхаром. Дарэчы, што было ўласціва і ранейшым уладальнікам маёнтка, — з элементамі натуральнай гаспадаркі: сад, агарод, рыба са ства, уласнага вырабу булкі, масла, мясныя далікатэсы...

— Жыць і працаваць тут ёсць каму: у нас з Наталляй 4 сыны. Сярэдні, напрыклад, летась больш за 2 месяцы не злазіў з трактара — газоны выкошваў. А малодшы, пяцігадовы, як зойдзем у альтанку, то можа сказаць: «Тата, давай прыбярэм». І — за мяцёлку. А цяпер на вуліцы не проста гуляе — бярэ лапату і снег чысціць.

Ды і самому Паўлу Альбінавічу даводзіцца не толькі кіраваць работамі па адраджэнні сядзібы.

— Сёння раніцай заходжу ў канюшню, а там вада замярзае. Вядома, трэба было тэрмінова прымаць меры, каб потым не цягаць ваду вёдрамі з калодзежа.

Дарэчы, першае, за што ўзяліся цяперашнія гаспадары, — гэта будынак канюшні, які раней выкарыстоўваўся калгасам пад ферму і ад якога заставаліся практычна толькі рэшткі старажытных сцен і дах, завалены ўнутр. Сёння там 8 коней — розных, у асноўным беларускіх парод. Гасцям сядзібы прапануюцца не толькі прагулкі па наваколлі на санях ці нават у шыкоўнай карэце, але і ўрокі верхавой язды.

Зразумела, што не кожная пабудова маёнтка сёння выконвае тыя ж функцыі, што і стагоддзі таму. Вось, напрыклад, былое халадзільнае памяшканне — лядоўня. Зімой, калі возера замярзала, выразалі пластамі лёд і прывозілі сюды, дзе разам з апілкамі выкарыстоўвалі для захоўвання прадуктаў. Сёння ў такім халадзільніку патрэбы няма, аднак у цяперашнім жылым будынку, яго інтэр'еры захаваны дух гісторыі — тоўстыя сцены, ацяпленне дровамі. Нават для тутэйшых дрэў узрост ці шкода ад прыроднай стыхіі — яшчэ не «прыгавор». Ясень, які рос побач з канюшняй, працягвае «жыць» у прыступках былой лядоўні. А дуб, які пагражаў фундаментам іншага будынка, стаў у ім апорай для перакрыцця другога паверха. І не проста канструкцыяй, а яшчэ і драўлянай скульптурай, якая, па задумцы Паўла Клімука, сімвалізуе беларусаў, іх процістаянне злым сілам.

— Бачыце, меч побач, але ж ён ні на каго не падняты.

Павага да гісторыі адчуваецца нават тады, калі сядзібныя аб'екты наогул не захаваліся. Вядома, напрыклад, што ў тутэйшых мясцінах былі распаўсюджаны вадзяныя млыны. А потым, як у вёсцы Караліно, ім прыйшлі на змену воданапорныя вежы. Такая вежа і служыць па прызначэнні, але яна знаходзіцца... унутры макета вадзянога млына. Зроблены ён па праекце млына ў вёсцы Адэльск Гродзенскага раёна, які працаваў яшчэ да пачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя.

Захавана і яшчэ адна традыцыя вялікіх маёнткаў, якія заўсёды мелі на сваёй тэрыторыі, у залежнасці ад веравызнання гаспадароў, цэркаўку ці касцёльчык. Цяперашнія гаспадары каралінскай сядзібы аднавілі і перадалі каталіцкаму прыходу ў Каробчыцах капліцу, дзе для мясцовых жыхароў праводзяцца ўсе рэлігійныя службы, у тым ліку вянчанне і хрэсьбіны.

І, вядома, дзе старадаўняя сядзіба — там і нейкія таямніцы, загадкі. Напрыклад, у адным з памяшканняў сёння не працуе мабільная сувязь. Літаральна за некалькі крокаў адсюль яна, хоць і з перабоямі, ёсць, а ў гэтым пакоі — ніякіх шанцаў. Трапіць туды можна праз падземны ход, што вядзе да цэнтральнага сядзібнага дома. Такі ход пад зямлёй на выпадак нейкай пагрозы лічылі патрэбным многія паважаючыя сябе гаспадары старажытных маёнткаў. Сёння тут размешчана летняя падвальная кухня, а побач, у недаступнай для мабільнай сувязі троннай зале, — 12 крэслаў з геральдыкай беларускай шляхты. Звяртаеш увагу і на столь — на кампазіцыю з 12 ключоў да аднаго замка. Гэта як сімвал таго, што ўсе людзі, нягледзячы на іх погляды і перакананні, павінны жыць у імя сваёй Айчыны.

«Жыць па-іншаму не ўмею»

У наступным годзе, разлічвае Павел Клімук, завершыцца рэканструкцыя асноўнага сядзібнага будынка, дзе будзе кавярня. Мяркуецца таксама стварыць музейную экспазіцыю, прысвечаную Антонію Тызенгаўзу і мясцовай этнаграфіі, распрацаваць анімацыйную праграму для дзяцей, каб у форме забавы знаёміць іх з гісторыяй, цікавінкамі каралінскага маёнтка і наваколля. Павел Клімук спадзяецца на зацікаўленасць аматараў сямейнага адпачынку, супрацоўніцтва з турыстычнымі фірмамі.

— Як камень ваду точыць, так і тут работа памаленьку ідзе. Гэта, пэўна, зусім не лепшы праект з пункту гледжання бізнесу. Але як праект для душы, сям'і, выхавання, павагі да нашай гістарычнай спадчыны, яе папулярызацыі — добры. Спадчына — гэта наша гісторыя. Гісторыя — гэта наша памяць. А памяць — гэта наша будучыня. Мне так здаецца. І жыць па-іншаму не ўмею.

Барыс ПРАКОПЧЫК. Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА

ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

Гісторыя каралінскай сядзібы сыходзіць сваімі каранямі ў глыб стагоддзяў. Нядаўна падчас рэканструкцыі асноўнага сядзібнага дома (ён шмат разоў перабудоўваўся) выявілі цэглу, якая па сваёй структуры і памеры была характэрная для XV-XVI стагоддзяў. На сёння няма поўных звестак аб шматлікіх гаспадарах маёнтка, бо архіў у Сувалках, дзе знаходзіліся адпаведныя дакументы, згарэў. Аднак вядома, што ў XV ст. прывілей на валоданне гэтымі землямі ад каралевы Рэчы Паспалітай Боны атрымалі ўплывовыя татарскія роды. А апошнім маёнтак купіў у 1924 годзе граф Козел-Паклеўскі. Потым гэтыя пабудовы належалі розным, ужо не прыватным, уласнікам і паступова прыходзілі ў заняпад...

Асабліва яскравую старонку ў гісторыю вёскі Караліно ўпісаў у другой палове XVIII ст. гарадзенскі староста Антоній Тызенгаўз. Па яго ініцыятыве распачалося стварэнне цудоўнага палацава-паркавага комплексу. Быў закладзены рэгулярны парк, узведзены жылыя і гаспадарчыя пабудовы. Аднак усе свае задумы Тызенгаўз ажыццявіць не паспеў. Палац, над праектам якога працаваў архітэктар яго каралеўскай вялікасці Джузэпэ дэ Сака, так і застаўся на паперы...

На тэрыторыі сядзібы.

■ Сувенір

МАНЕТЫ ДЛЯ ЗАКАХАНЫХ

На Дзень усіх закаханых у музеі Гомельскага палацава-паркавага ансамбля можна будзе ўласнымі рукамі адчаканіць сабе сапраўдную манетку.

Такая паслуга, якую прэзентуюць падчас самага чаканага лютаўскага свята, будзе дзейнічаць пастаянна. У гомельскім палацы для гэтай мэты набылі спецыяльнае абсталяванне: міні-станок для халоднай чаканкі сувенірных манет вытворчасці Пецярбургскага манетнага двара, а таксама прылады айчынных майстроў. Гэта дазволіць любому ахвотнаму за некалькі хвілін вырабіць сабе памятную манету.

Дырэктар музея Гомельскага палацава-паркавага ансамбля Аксана ТОРАПАВА адзначыла:

— Стварэнне міні-кузні — гэта не толькі пашырэнне пераліку паслуг для шматлікіх наведвальнікаў і турыстаў палаца Румянцавых-Паскевічаў, але і адраджэнне старых добрых традыцый, якія раней існавалі сярод прадстаўнікоў вышэйшага свету. Напрыклад, вядома, што ў гонар шлюбу ўладальнікаў гомельскага маёнтка Ірыны Іванаўны і Фёдара Іванавіча Паскевічаў таксама была адліта памятная манета з выявай сямейных гербаў, якая цяпер знаходзіцца ў адной з экспазіцый музея.

Сучасныя манеты плануюць вырабляць з медзі і алюмінію. На адным баку будзе адчаканены лебедзь, на другім — сэрца. На замову музея распрацоўваюцца яшчэ чатыры віды манет з відарысамі герба горада Гомеля, выявамі палацава-паркавага ансамбля і яго былых уладальнікаў.

Такую паслугу плануюць прапанаваць і маладым, якія праводзяць фота- і відэаздымкі ў зімовым садзе палацава-паркавага ансамбля.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

«Дзе расце дзіванна — без пасагу панна»

Мабыць, не ўвесь час нам пра паноў ды баляванні размаўляць. Калі-нікалі варта зазірнуць у лекавую аптэчку нашых продкаў, паслухаць народныя паданні пра зёлкі і іх магічныя ды лекавыя ўласцівасці, якія калісьці так шмат значылі для людзей. Бо ранейшае жыццё было звязана з прыродай, а не з высокімі тэхналогіямі і маркетынгам. Першай раслінай, пра якую хочацца распавесці, будзе дзіванна.

Рэстаран «Замак Зеваны» ў гродненскім маёнтку Каробчыцы лічыцца адным з самых славутых у Беларусі. Як сцвярджаецца ў рэкламе гэтай установы, ён названы ў гонар Зеваны — быццам бы агульнаславянскай багіні палявання. Прыгожы велізарны вітраж з яе выявай аздабляе прасторную высокую залу рэстарана. Толькі трохі рэжа вуха гэтае імя — Зевана.

На самой справе, ні ў якіх старых летапісах і іншых гістарычных дакументах такое імя не сустракаецца. Багіню Зевану міфолагі рэканструявалі гіпатэтычна, засноўваючыся толькі на паведамленнях польскага храніста Яна Длугаша. А ён апісаў, насамрэч, багіню Дзіванну. Гэта ўжо ў рускай мове гэтае імя трохі змянілі, бо «дзеканне» ёй не ўласціва. Цалкам магчыма, што Длугаш і не сутыкаўся з народнымі паданнямі пра багіню паляванняў, а выдумаў іх сам — каб паказаць славянскую міфалогію не горшай за рымскую і грэчаскую з яе Дзіянай-Артэмідай. Імя ж для багіні абраў па сугучнасці з Дзіянай і з досыць вядомай некалі травой, якая для нашых продкаў мела большае значэнне, чым для нас.

Па-беларуску яна называецца «дзіванна», а часам і «мядзведжым вухам», бо яе вялікія, мяккія і кашлатыя лісты трохі нагадваюць вушы звярынага цара нашых лясоў. І мне падаецца, што гэтае імя ў назве рэстарана гучала б больш аўтэнтычна і выклікала б пэўныя асацыяцыі.

Дзіванна расце ў неўрадлівых месцах, пазбягаючы канкурэнцыі з іншымі раслінамі: па камяністых схілах, у стэпах, на сухіх лугах, на ўзбочынах дарог. Адсюль паходзіць даўняя прыказка: «Дзе расце дзіванна — без пасагу панна». У аповесці Элізы Ажэшкі «Хам» Павел упершыню спрабуе абняць Франку ў зарасніку дзіванны. Відавочна, што Ажэшка, вялікая аматарка зёлак, свядома ўжывае гэты сімвалізм, як прароцтва будучага лёсу герояў: дзяўчына без пасагу і, як высвятляецца, без неабходнай для добрай сям'і цнатлівасці на фоне зарасніку травы, што атаясамліваецца з беднасцю і няшчасцем. Але, нягледзячы на гэткую «песімістычную» сімволіку, гэта расліна мае нямала лекавых уласцівасцяў.

Адвар або спіртавы настой з розных відаў дзіванны (бо гэта цэлы батанічны род) — гэта традыцыйныя народныя лекі, якія дапамагаюць ад кашлю, астмы і іншых захворванняў органаў дыхання, а таксама ад хвароб страўніка, апёкаў і іншых пашкоджанняў скуры. Калі не было шампуняў, адварам дзіванны мылі валасы: яна асвятляе іх і надае бляск. Пакуль у сярэдзіне XIX стагоддзя не распаўсюдзілася гарбата, адвар дзіванны быў адным з самых папулярных напояў на нашых землях. Панна Саламея з апавядання Ігнацыя Ходзькі «Самавар» просіць свайго бацьку не адставаць ад моды: «Ах! Самавары, папуню, самавар і чай! Гэта ж паўсюль п'юць гарбату зранку і ўвечары нават, а мы адны толькі ліпавым цветам і дзіваннай душыцца мусім. Папа, далібог мусіш купіць самавар». Кветкі дзіванны змяшчаюць эфірны алей з характэрным мядовым водарам, таму ў адвар дадавалі мёд, каб падкрэсліць гэты водар, а таксама рабілі адмысловы «мёд» з цукру і кветак дзіванны.

Настой ці адвар кветак трэба старанна працэджваць праз некалькі слаёў марлі, каб выдаліць дробныя валаскі, здольныя выклікаць раздражненне стрававода і страўніка. Жывёлы ведаюць пра гэтую ўласцівасць дзіванны і таму пазбягаюць яе. Магчыма, гэтая самотнасць дзіванны, непрыхільнасць як да іншых раслін, так і да жывёл здаўна ўражвала нашых продкаў і прымушала верыць у яе асаблівыя ўласцівасці. Яшчэ ў антычнасці думалі, што дзіванна адпужвае злых духаў. Адысей ратаваўся ад чараў Цырцэі, спальваючы яе сцёблы. Ад іх, дарэчы, і дагэтуль у Літве запальваюць пахавальныя свечкі. Сухія сцёблы дзіванны вельмі добра гараць, таму з іх даўней выраблялі факелы, прапітваючы воскам або лоем.

Вось такой загадкавай і карыснай была калісьці дзіванна для нашых продкаў. У яе апісаннях захоўваецца багатая гісторыя і шмат падстаў для фантазіі, для сувязі нашага ўяўлення з уяўленнямі мінулых пакаленняў. Усё гэта варта вывучаць, калі мы ствараем рэстараны, музеі ды іншыя турыстычныя аб'екты. Бо здаецца, што годную легенду лёгка прыдумаць, а галоўнае, маўляў, «добра раскруціць». Насамрэч самыя папулярныя і даўгавечныя легенды — тыя, якія абапіраюцца на сапраўдныя жывыя пачуцці нашых продкаў, на здарэнні ў жыцці рэальных людзей і папулярных літаратурных персанажаў. «Зевана» ці «Дзіванна» — здавалася б, колькі той розніцы? А яна ёсць — у глыбіні, у сапраўднасці, у вернасці традыцыям зямлі, у памяці пра тых, хто жыў на ёй да нас.

АДВАР З ДЗІВАННЫ

1 ст. лыжку сушаных кветак дзіванны заліваем шклянкай кіпеню, настойваем каля паўгадзіны. Ужываем 2 разы на дзень па паўшклянкі, можна з мёдам.

«МЁД» З ДЗІВАННЫ

Толькі сарваныя кветкі пластамі перасыпаюць карычневым цукрам. Слоік пакідаюць на некалькі дзён, затым старанна працэджваюць праз некалькі пластоў марлі, памятаючы пра непрыемныя драбнюткія валаскі. Можна трымаць у лядоўні каля 2 тыдняў.